НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Дзяржаўная навуковая ўстанова
«ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ»

філіял «ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ»

# ПЫТАННІ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАЛОГІІ І ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

## ВЫПУСК 34

Мінск
«Права і эканоміка»
2023

УДК 39 (=161)
ББК 63.5
П95

Калегіяй ВАК Беларусі ад 15.11.2007 зборнік уключаны
ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання
вынікаў дысертацыйных даследаванняў.

Рэдакцыйная калегія:
А. А. Каваленя, І. Шыркайтэ, С. Іспас, Г. А. Скрыпнік, А. І. Лакотка,
М. Ф. Піліпенка, Т. В. Валодзіна, А. В. Гурко, В. І. Жук, Б. А. Лазука, Т. Г. Мдзівані,
А. М. Ненадавец, В. С. Новак, Я. М. Сахута, Р. Б. Смольскі, Н. Ц. Фральцова,
Г. П. Цмыг, В. М. Шарая, В. М. Ярмалінская, В. Д. Міцкевіч

Навуковы рэдактар:
акадэмік А. І. Лакотка

Рэцэнзенты:
доктар архітэктуры А. С. Сардараў
доктар гістарычных навук Т. А. Навагродскі

Рэдактар-укладальнік:
кандыдат філалагічных навук А. Г. Алфёрава

П95 **Пытанні** мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 34 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2023. – 706 с. – ISSN 2221-9919

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы, у якіх прадстаўлены новыя вынікі даследаванняў, актуальныя для вырашэння сучасных праблем нацыянальнай культуры. Гэта матэрыялы супрацоўнікаў і аспірантаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, вышэйшых навучальных устаноў Беларусі і іншых краін.

Адрасуецца спецыялістам у галіне гуманітарных навук, выкладчыкам і студэнтам, усім, хто цікавіцца дадзенай праблематыкай.

*Зборнік выдаецца ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2021 – 2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (падпраграма «Культура і мастацтва»).*
*Частка артыкулаў прадстаўлена ў рамках Праграмы навуковага супрацоўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.*

**УДК 39 (=161)**
**ББК 63.5**

**ISSN 2221-9919**

© ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры», 2023
© Афармленне. «Права і эканоміка», 2023

*Мазурына Н. Г.* 480
ФЕНОМЕН ПРАДКАЗАЛЬНАСЦІ/НЕПРАДКАЗАЛЬНАСЦІ ДЫНАМІКІ СЛОЎНА-МУЗЫЧНАГА ТЭКСТУ: МЕЖЫ І МАГЧЫМАСЦІ ВАРЫЯНТНАСЦІ

*Махоўская І. С.* 491
ЭКАНАМІЧНЫЯ ПАВОДЗІНЫ ЯК ФАКТАР САЦЫЯЛЬНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ Ў ТРАДЫЦЫЙНЫМ ГРАМАДСТВЕ

*Милюченков С. А.* 501
ТИПЫ БАНЬ В СЕЛЬСКИХ ПОСЕЛЕНИЯХ БЕЛАРУСИ XVI – НАЧАЛА XX В.

*Морозова Т. А.* 511
БЕЛОРУССКОЕ ФОЛЬКЛОРНОЕ ТВОРЧЕСТВО НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ: ЖАНРОВО-ВИДОВОЙ СОСТАВ, ОСОБЕННОСТИ СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ ДИНАМИКИ

*Ненадавец Я. А.* 522
КАПАННЕ СТУДНЯЎ У 50 – 70-Я ГАДЫ XX СТ. НА ПІНШЧЫНЕ ПАВОДЛЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

*Новак В. С.* 530
МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ДОБРУШСКАГА РАЁНА

*Олюнина И. В.* 540
ПРОЕКТИРОВАНИЕ ЭТНОГРАФИЧЕСКОГО ТУРА: ПОДГОТОВИТЕЛЬНЫЙ ЭТАП

*Паборцава К. В.* 549
ДА ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ПЕРСАНАЖАЎ НІЖЭЙШАЙ МІФАЛОГІІ БЕЛАРУСАЎ (ГІСТАРЫЧНЫ ПЕРЫЯД 1873 – 1912 ГГ.)

*Селях А. А.* 557
БАЎЛЕННЕ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ МОЛАДДЗЮ Ў 2-Й ПАЛОВЕ 1940-Х – 1980-Я ГАДЫ

*Станкевіч А. А.* 567
СЛОЎНА-ВОБРАЗНАЕ ВЫРАЖЭННЕ ЗМЕСТУ БЕЛАРУСКІХ ПАРЭМІЙ, ПРЫСВЕЧАНЫХ НАРОДНАМУ КАЛЕНДАРУ

*Тяпкова А. И.* 578
ЗНАЧЕНИЕ И РОЛЬ ФЕСТИВАЛЬНЫХ ТРАДИЦИЙ В СОХРАНЕНИИ И РАЗВИТИИ КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ БЕЛАРУСИ

*Фу Сюеин* 589
ТИПОЛОГИЯ СОДЕРЖАТЕЛЬНЫХ КОМПОНЕНТОВ В БЕЛОРУССКИХ И КИТАЙСКИХ ТОПОНИМИЧЕСКИХ ЛЕГЕНДАХ

*Хазанава К. Л.* 601
НАЙМЕННІ АБУТКУ Ў БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ПРЫКАЗКАХ І ПРЫМАЎКАХ

SUMMARY

The article analyzes the works of folklorists of the 19th century, in which they reflected the information about the characters of lower mythology. Special attention is focused on the works of E. R. Romanov, Z. F. Radchenko, P. M. Shpilevsky, A. K. Kirkor and others, which characterize demonological images. The author of the article emphasizes the value of Belorussian mythological prose about the images of folk demonology and related folk beliefs for modern research.

***Селях А. А.***

# БАЎЛЕННЕ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ МОЛАДДЗЮ Ў 2-Й ПАЛОВЕ 1940-Х – 1980-Я ГАДЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 13.03.2023)*

Гісторыя штодзённасці ўключае розныя аспекты жыццядзейнасці чалавека. Адной з неад’емных «структур» чалавечага жыцця з’ўляюцца забаўляльныя практыкі. Формы баўлення вольнага часу моладзі ў беларускай этналагічнай навуцы разглядаліся даследчыкамі з улікам рэгіянальнай спецыфікі. У публікацыях І. Ю. Смірновай даследавалася спецыфіка маладзёжных вячорак на Міншчыне, Гомельшчыне, Брэстчыне [1 – 4]. Артыкулы А. Б. Захарэвіч прысвечаны вывучэнню формаў баўлення вольнага часу моладзі на тэрыторыі Падзвіння [5; 6]. Традыцыі моладзевых зносін на тэрыторыі Брэсцкага Палесся вывучала А. А. Гугнюк (Селях) [7 – 9]. Адметнасцю прац з’яўляецца выкарыстанне матэрыялаў з асабістых палявых даследаванняў аўтараў, што дазваляе больш поўна, праз прызму прыватнага жыцця жыхароў

вёсак рэканструяваць старонкі беларускай культуры. У айчыннай гістарыяграфіі праблема вольнага часу моладзі вывучалася пераважным чынам у межах 1-й паловы XX ст. Меншая ўвага нададзена аналізу спецыфікі форм моладзевага адпачынку ў 2-й палове XX ст. Мэта нашага даследавання – разгляд форм баўлення вольнага часу заходнепалескай моладдзю ў 2-й палове 1940-х – 1980-я гады. Асноўную частку крыніц для даследавання склалі палявыя матэрыялы, сабраныя аўтарам у сельскіх мясцовасцях Брэстчыны.

Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця заходнепалескага рэгіёна сталі падставай разглядаць праблему, падзяліўшы адзначаны храналагічны перыяд на 2 этапы: 2-я палова 1940-х – 1950-я і 1960 – 1980-я гады. Пасляваеннае штодзённае жыццё вясковых дзяўчат і юнакоў не было пазбаўлена адпачынку і забаў. Кажучы пра змест і формы баўлення вольнага часу ў пасляваеннай вёсцы, адзначым іх абмежаванне, з аднаго боку, рытмам працоўнай дзейнасці (земляробчых і хатніх клопатаў), з другога – сацыяльна-эканамічным становішчам. Вольны час моладзі пасля вайны змяшчаў заўважны пласт традыцыйнай сялянскай культуры. Цяжкасці матэрыяльнага становішча сем'яў вымушалі вяртацца да традыцыйных промыслаў (прадзення, ткацтва, шыцця) амаль на працягу ўсяго пасляваеннага дзесяцігоддзя. У гэты перыяд асноўнай формай баўлення часу вясковай моладзі заставаліся «вячоркі» і «попрадкі». Наяўная рэальнасць вызначала пераважна «працоўную» скіраванасць гэтых мерапрыемстваў: *«Сходілась маладёжь: хто перья, скубёт, хто в'яжа»* (зап. у 2021 г. ад Я. П. Серады, 1937 г. н., у в. Батчы, Кобрынскі р-н); *«Пусля вайны всё сваі роботы було, самі рубелэ. Фартушкэ шелэ, сорочке полотненые, постулэ»* (зап. у 2021 г. ад Г. С. Саўчук, 1933 г. н., у в. Сварынь, Драгічынскі р-н). З мэтай прыемна і весела правесці час у

кампаніі дзяўчат вячоркі наведвалі хлопцы. І, калі першыя занадта засяроджваліся на сваёй працы, хлопцы маглі яе сапсаваць: падпаліць кудзелю, зняць з яе пражу і заблытаць ніткі, схаваць верацяно, скінуць шнур: *«Прыдуть хлопцы з гармонем – кудэлі в куток, і танцы. Пэсок ано в гору лэтыть»* (зап. у 2021 г. ад Н. С. Юрко, 1932 г. н., у в. Моладава, Іванаўскі р-н); *«Вона кудэлю прадэ, а сіджу боком і – раз, пальцам шнур скэну. Нытку от кудэлі, раз, часом одорваў. Такія вэсэлосці булы»* (зап. у 2022 г. ад А. В. Прыступчыка, 1924 г. н., у в. Ляхчыцы, Кобрынскі р-н).

Пытанне арганізацыі вольнага часу насельніцтва, уключаючы падлеткаў і моладзь, у кантэксце разгортвання культурна-масавай работы ў вёсцы ў пасляваенны перыяд было дастаткова актуальным, паколькі яно разглядалася як частка агітацыйна-прапагандысцкай працы [10]. У хуткім часе пасля заканчэння ваенных падзей (2-я палова 1940-х – 1950-я гг.) у вёсцы пачалі ствараацца цэнтры культурнага жыцця, пераважным чынам клубы, хаты-чытальні, чырвоныя куткі, гурткі самадзейнасці. Так, ужо ў 1946 г. у Пружанскім раёне, згодна са справаздачай аб працы культасветустаноў, была наладжана праца 2 хат-чытальняў, 82 чырвоных куткоў, 6 клубаў, а таксама гурткоў самадзейнасці, сярод якіх 23 драматычных, 21 харавых, 12 танцавальных, 2 музычных [11, арк. 2, 8]. Загадвалі імі, як правіла, мясцовыя настаўнікі. Моладзь і дарослыя маглі паслухаць лекцыі, радыё, пачытаць часопісы, паглядзець кінакарціны. Так, загадчык хаты-чытальні ў вёсцы Стрыгава Кобрынскага раёна ў выпуску раённай газеты за сакавік 1948 г. пісала: «...сумесна з камсамольскай арганізацыяй в. Стрыгава мы правялі некалькі моладзевых вечароў. Запрасілі гарманіста, арганізавалі спачатку танцы, потым ўперамешку з танцамі калектыўнае радыёслуханне, чыткі газет і часопісаў, таварыскія

гульні <…> Наведванне хаты-чытальні ўжо ўвайшло ў звычку моладзі і сялян» [12]. У моладзі Пескаўскага сельсавета Кобрынскага раёна любімым месцам збору была сядзіба «Патрыкі»: «У прасторнай хаце, дзе змяшчаюцца кантора саўгаса і чырвоны куток камсамольскай арганізацыі, збіраюцца дзясяткі юнакоў і дзяўчат з Патрык, Мазур, Забужак і іншых суседніх вёсак. Пад кіраўніцтвам камсамольцаў саўгаса тут ладзяцца масавыя таварыскія гульні, танцы пад гармонік, выконваюцца народныя песні, наладжваецца кінапаказ» [13]. Газета «Чырвоная зорка» паведамляла аб тым, што на пачатак 1954 г. густая сетка культурна-асветніцкіх устаноў працавала ў Драгічынскім раёне: 1 раённы і 1 сельскі дамы культуры, 7 сельскіх клубаў, 18 хат-чытальняў, 7 сельскіх і 2 гарадскія бібліятэкі. Акрамя гэтага, па абслугоўванні насельніцтва раёна працавала 14 кінаўстановак, з іх 9 перасоўных [14, с. 407]. Культурнае жыццё, разбуранае вайной, паступова адраджалася і ў Пінскім раёне. Калі ў 1948 г. было 16 хат-чытальняў, 3 раённыя і 4 сельскія бібліятэкі, то ў 1956 г. працавалі раённы Дом культуры, 11 сельскіх ДК, 12 бібліятэк, 4 сельскія клубы, 18 хат-чытальняў, 48 калгасных клубаў [15, с. 449 – 450].

Разам з тым, звяртае на сябе ўвагу якасць працы культурна-асветніцкіх устаноў. Тыповая карціна стану цэнтраў культурна-масавага жыцця ў сельскай мясцовасці адлюстравана ў пратаколе пасяджэння першай сесіі Бярозаўскага раённага Савета дэпутатаў працоўных ад 7 сакавіка 1963 г.: «Узровень культурна-асветніцкай работы ў раёне яшчэ адстае ад пастаўленых задач. Большасць сельскіх клубаў і сельскіх дамоў культуры яшчэ не з’яўляюцца праваднікамі культуры ў вёсцы. Амаль усе яны не ацяпляюцца, пра якую ж працу можна казаць у такіх клубах? Ёсць такія клубы, якія з’яўляюцца не ўзорам культуры, а рассаднікам бескультур’я. Дрэнна яшчэ працуюць па абслугоўванні

насельніцтва не толькі сельскія клубы, але і РДК г. Бяроза, дзе акрамя стыльных танцаў, прычым пачварна скажоных, нічога амаль не праводзіцца супрацоўнікамі РДК» [16, арк. 26]. Непрыхільна ахарактарызавана праца па аргінізацыі адпачынку моладзі ў канцы 1950-х гадоў у Кобрыне: «Трэба прама сказаць, што праца арганізавана дрэнна. У вольны час маладыя людзі бязмэтна ходзяць па вуліцах. Адзінай забавай з'яўляюцца танцы: летам – у парку, восенню і зімой – у клубе і ў ДК. Не праходзяць танцы без хуліганства <…> Час райкому камсамола ўсур'ёз заняцца адпачынкам моладзі» [17].

Знамянальнай падзеяй у вёсцы ў 50 – 60-я гады XX ст. быў паказ кінафільмаў, куды збіралася ў тым ліку і моладзь. Як успаміназа рэспандэнтка, *«кэдалэ картоплі садэтэ, талушкі доіты – біглы на кіно»* (зап. у 2021 г. ад Г. М. Міхальчук, 1946 г. н., у в. Дарапеевічы, Маларыцкі р-н). Прысутнічаць на кінапаказе, як расказвалі інфарманты, атрымлівалася не ва ўсіх, асабліва ў дзяцей і падлеткаў: *«Кіномеханік прыйізжав. Дэсь собралэсь, на грушы повісылэ простэнь, і там двіжок стоіть, якось його прымайстроўвалэ. На брыгадэ (мехдвор), в конюшні, прыбэруть, підмэтуць. Людэй то мніго було. А после в школі сталэ показватэ гэты кіна. 5 копіёк білет. Мама даст 5 копіёк, яйцэ якое здасэ, бутылкэ здасэ в магазін. Дэ колы сцягвалэ (кралы) 5 копіёк»* (зап. у 2021 г. ад З. П. Селях, 1952 г. н., у в. Батчы, Кобрынскі р-н); *«Выпросіш у матэры дві яйці, то попадэш на кіно. Трэба ейця шукаты, колы кіно прыйідэ»* (зап. у 2022 г. ад А. А. Сцепанюка, 1938 г. н., у в. Дарапеевічы, Маларыцкі р-н).

Нягледзячы на спробы ўлады арганізаваць культурнае жыццё ў вёсцы адпаведным чынам (з канкрэтнымі формамі і зместам мерапрыемстваў), дамінуючай формай баўлення часу ў 50 – 60-я гады XX ст. былі традыцыйныя «вячорачныя зборні». Мы выкарыстоўваем

гэтае паняцце як адзін з відаў адпачынку і забаў моладзі ў вольны ад працы час, якія праводзіліся ў памяшканні або на адкрытай прасторы. У вёсках Заходняга Палесся існавалі шматпланавыя зборышчы моладзі, якія дзейнічалі па сваіх, прынятых усімі звычаях. Іх мясцовыя назвы былі разнастайныя. Пры гэтым адзін і той жа тып моладзевых сустрэч мог мець розныя назвы. І наадварот, розныя віды маглі бытаваць у адным або розных раёнах пад адным найменнем. Сярод асноўных формзборняў заходнепалескай моладзі, якія называлі рэспандэнткі, былі «музыка», «танцы», «гулыця». Месца збору адпавядала сезону: у вясенне-летні перыяд збіраліся на вуліцы, восенню і зімой – у хаце. Жанчыны ўспаміналі: *«Вжэ гармоніст прыходыть. Кругом тако лавкі пораставляють самоделочные, а посрединочке танцы»* (зап. у 2021 г. ад Н. І. Марчук, 1946 г. н., у в. Пруск, Жабінкаўскі р-н); *«Субота чы наділя – до 11, 12 часов танцы на вулыці. Дядьку гармоніста запросым. Зімою – по домам танцувалы»* (зап. у 2022 г. ад Я. А. Пашкевіч, 1942 г. н., у в. Спорава, Бярозаўскі р-н). Не зніклі яшчэ з бытавання ў гэты перыяд традыцыйныя вячоркі (як працоўнае мерапрыемства). Асобныя ўспаміны сведчаць аб іх захаванні да 70 – 80-х гадоў XX ст. Дзяўчаты па-ранейшаму працягвалі засвойваць і практыкаваць навыкі (вышыўка, ткацтва, вязанне) на вячорках. Але вязалі і вышывалі ў большасці выпадкаў з мэтай ўпрыгожвання хатняга інтэр’ера: *«На будні былі вэчоркі. Хто прав, хто вышывав, хто гарункы вязав. Я рушника вышываты ходыла. Якіе там вышывкі булы, колы там хлопцы? Тые хлопцы так зашыюць того рушніка, шо трэба попораскідаты, шоб маты ны бачіла, шо там нароблёна»* (зап. у 2022 г. ад Н. Л. Янушчык, 1962 г. н., у в. Бездеж, Драгічынскі р-н); *«До Нового года и после Крещения ставили станок ткацкий по очереди по домам. Ткали*

*рушники, ходники, вышивали»* (зап. у 2022 г. ад В. М. Гузарэвіч, 1963 г. н., у в. Новы Двор, Пінскі р-н).

З цягам часу моладзевыя вечарыны перажылі пэўную трансфармацыю: перамясціліся з хат і надворкаў уклубы. Альтэрнатывай хатнім «вячоркам», вулічным «музыкам» сталі танцы ў клубах. Але, акрамя клуба, дзяўчаты і юнакі, як і раней, збіраліся для баўлення часу на вуліцы: *«Летом, как канікулы, собіралісь всі, і в клубе танцы. В будніе дні клуб закрыт,то соберёмся у одной девочкі.Помню, у её двор большэй бyв, і хлопцы вжэ на машынах тэх робочых, колхозных, прыйідуть. Одэн з однэі стороны станэ, другі – з другоі, свет повключають і танцы всю ноч, музыка греміт»* (зап. у 2022 г. ад С. С. Міранюк, 1945 г. н., у в. Навасёлкі, Кобрынскі р-н).

Формы баўлення вольнага часу ў значнай ступені вызначаліся канфесійнай прыналежнасцю. Праваслаўнаму і каталіцкаму насельніцтву былі ўласцівы аналагічныя па форме і зместу моладзевыя камунікацыі. Спецыфічнасцю вызначалася баўленне вольнага часу пратэстанцкай моладдзю: *«На танцы я худэла, алэ ны танцювала. Маты ны рузрышала, бо веруюшчая була. На музэкі ныльзя іты»* (зап. у 2021 г. ад Г. С. Саўчук); *«Мы своих компаний держались. В клуб было ходить неприемлемо. У нас считалось это всё мирское, нам это нельзя. В деревне 2 недели перед рождеством и после проводились “святые вечера”. Все верующие собирались, пели, общались»* (зап. у 2022 г. ад Т. А. Рыжук, 1957 г. н., у г. Кобрын).

У вясенне-летні перыяд у заходнепалескіх вёсках у 1960 – 1980-я гады, акрамя танцаў у клубах і на двары, існавалі агульнавядомыя месцы, куды падцягвалася ўся моладзь для баўлення часу. Спецыфічнымі ў розных мясцовасцях былі назвы месцаў збору: «каля Сёмака» (ад імя гаспадара, на лаўцы якога збіраліся); «за гумнамі», «на

бабу» (назва драўлянага слупа); «на прэзьбах», «кола лыпы», «кола трансформатора». Часам знакавым месцам кансалідацыі былі часткі вёскі, што мелі свае найменні: *«На выгонках збыралыся, на сэлі, на заболотті, на шыроком»* (зап. у 2022 г. ад Н. І. Ксёнда, 1960 г. н., у а/г Тышкавічы, Іванаўскі р-н).

Папулярнай формай адпачынку былі школьныя вечары. Моладзь збіралася ў школе, дзе спачатку, як правіла, чыталася нейкая тэматычная лекцыя, пасля якой ладзіліся танцы. Танцавалі пад гармонік, патэфон, пазней – магнітафон.

Прыкладна з канца 1960-х гадоў у побыт вясковых хлопцаў і дзяўчат увайшло святкаванне «Дня савецкай моладзі». Як успаміналі жанчыны, за вёскай, на лясной паляне ці каля возера, мясцовая адміністрацыя арганізоўвала святкаванне, фестываль. Расстаўляліся гандлёвыя палаткі, ладзіліся канцэрты. У некаторых вёсках у гэты дзень арганізоўвалі паездкі ў гарадскі парк на танцы: *«Привозили молодёжь с деревень в машинах, газонах бортовых в парк. Море машин, молодёжи море, носа не всунешь на танцплощадку»* (зап. у 2022 г. ад Л. Д. Садоўскай, 1949 г. н., у в. Бярэзніца, Пружанскі р-н); *«Як то день молодёжі, то нас, дівчат і хлопців, грузовэйю машыною вэзуть у парк. То мы дывымось вжэ, як воны* (гарадская моладзь. – *А. С.*) *там ходять»* (зап. у 2022 г. ад Н. П. Барысюк, 1942 г. н., у в. Ляхчыцы, Кобрынскі р-н).

Такім чынам, у 2-й палове 1940-х – 1980-х гадах існавалі featuresрознапланавыя формы кансалідацыі заходнепалескай моладзі. Баўленне часу знаходзілася ў карэляцыі з сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі працэсамі, якія адбываліся ў вёсцы ў адзначаны перыяд. У пасляваеннае дзесяцігоддзе актуальным было наладжванне традыцыйных вячорак з працоўнай скіраванасцю. Пачынаючы з 2-й паловы 1950-х – 1960-я гады,

калі адбылося паляпшэнне матэрыяльна-побытавых умоў вясковага жыцця, узніклі культурныя ўстановы, папулярнымі практыкамі адпачынку ў моладзевым асяроддзі былі танцы ў клубах, а таксама «музыка» і «танцы» на адкрытай прасторы, якія насілі забаўляльны характар і выконвалі рэлаксацыйную функцыю. У канцы 1960-х – 1980-х гадах, нягледзячы на пашырэнне ў вёсцы працы клубаў, дамоў культуры, не згубіла актуальнасці традыцыя моладзевых збораў на вулічных прасторах. Моладдзю вызначаліся свае «цэнтры» – месцы сустрэч, што мелі спецыфічныя ў розных мясцовасцях назвы.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Смирнова, И. Ю. Неглюбские молодёжные вечера зимнего периода / И. Ю. Смирнова // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся : матэрыялы міжнар. навук. канф., Гомель, 20-21 мая 2004 г. : у 2 ч. / гал. рэд. А. А. Станкевіч. – Гомель, 2004. – Ч. 1. – С. 193 – 197.

2. Смірнова, І. Ю. Калядныя вячоркі / І. Ю. Смірнова // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агульн. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск, 2008. – Т. 4. Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – Кн. 1. / В. І. Басько [і інш.] – С. 55 – 62.

3. Смірнова І. Ю. Піліпаўскія вячоркі / І. Ю. Смірнова // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агульн. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск, 2008. – Т. 4. Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – Кн. 1. / В. І. Басько [і інш.] – С. 226 – 233.

4. Смірнова, І. Ю. Маладзёжныя вячоркі на Міншчыне / І. Ю. Смірнова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29-30 красавіка 2010 г. / рэдкал.: М. А. Мажэйка (старшыня), В. В. Калацэй, С. К. Канановіч. – Мінск, 2010. – С. 68 – 70.

5. Захарэвіч, А. Б. Вячоркі як адна з формаў баўлення вольнага часу ў беларускай вёсцы Падзвіння ў 1930 – 1950-я гг. / А. Б. Захарэвіч // Труды молодых

специалистов Полоцкого государственного университета. Гуманитарные науки. – Новополоцк, 2010. – Вып. 41. – С. 63 – 64.

6. Захарэвіч, А. Б. Радыё і кіно як формы баўлення вольнага часу беларускай моладзі ў 2-й чвэрці XX ст. / А. Б. Захарэвіч // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклярыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2016. – Вып. 21. – С. 160 – 165.

7. Гугнюк, О. «Деревенские вечёрки»: традиции гендерного общения сельской молодёжи в середине XX в. (на полевых материалах Брестского Полесья) / О. Гугнюк // Wspólne dziedzictwo kulturowe. Dialog kultury z naturą / red. M. Winograd. – Białystok, 2016. – С. 430 – 440.

8. Гугнюк, О. А. Вечёрочные мероприятия в культуре повседневности села в 20 – 40 гг. XX в. (на примере Малоритчины) / О. А. Гугнюк // XVIII Республиканская научно-методическая конференция молодых учёных, Брест, 13 мая 2016 года : сб. материалов, : в 2 ч. / ред. А. Е. Будько. – Брест, 2016. – Ч. 1. – С. 101 – 102.

9. Гугнюк, О. А. К вопросу о названиях досуговых мероприятий сельской молодёжи на Брестчине (30 – 50 гг. XX в.): опыт исследования / О. А. Гугнюк // Первый шаг в науку – 2016 : сб. материалов Междунар. форума «Первый шаг в науку – 2016», Минск, 4-5 ноября 2016 г. : в 2 ч. / Центр молодёжных инноваций ; Минский городской технопарк. – Минск, 2016. – Ч. 1. Секционные заседания студенческой молодёжи – С. 191 – 193.

10. Назаров, А. И. Досуг сельской молодёжи в советском тылу в годы Великой Отечественной войны [Электронный ресурс] / А. И. Назаров.– Режим доступа: https://www.gramota.net/materials/3/2009/3/32.html. – Дата доступа: 06.03.2023.

11. Отчёт о работе культпросветучреждений Пружанского района по состоянию на 20 мая 1946 г. // Зональный государственный архив в г. Кобрине (ЗГАКоб). – Ф. 421. Оп. 1. Д. 1. Л. 2 – 8.

12. Тарасюк, В. Как мы наладили работу избы-читальни / В. Тарасюк // Труд. – 1948. – 25 марта. – С. 2.

13. Тибаровский, В. В часы досуга / В. Тибаровский // Труд. – 1948. – 18 марта. – С. 2.

14.	Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Драгічынскага раёна / рэдкал.: Я. Я. Аляксейчык (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск : БелТА, 1997. – 575 с.

15.	Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пінскага раёна / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск : БелТА, 2003. – 624 с.

16.	Протокол № 1 заседания первой сессии Берёзовского районного Совета депутатов трудящихся 9-го созыва (от 07 марта 1963 г) // ЗГАКоб. – Ф. 232. Оп. 1. Д. 211. Л. 2 – 34.

17.	Лукашук, Д. Пагаворым аб адпачынку моладзі / Д. Лукашук // Праца. – 1958. – 29 лістапада. – С. 2.

РЕЗЮМЕ

Статья посвящена осмыслению проблемы проведения свободного времени западнополесской молодёжью во 2-й половине 1940-х – 1980-е годы. Основываясь на архивных и полевых источниках, автор рассматривает основные формы организации досуга молодёжи.

SUMMARY

The article is devoted to understanding the problem of spending free time of the youth of Western Polesie in the second half of the 1940s – 1980s. Based on archival and field sources, the author examines the main forms of youth leisure activities.

***Станкевіч А. А.***

# СЛОЎНА-ВОБРАЗНАЕ ВЫРАЖЭННЕ ЗМЕСТУ БЕЛАРУСКІХ ПАРЭМІЙ, ПРЫСВЕЧАНЫХ НАРОДНАМУ КАЛЕНДАРУ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 01.03.2023)*

Прыказкі і прымаўкі займаюць асобнае месца ў сістэме розных жанраў вуснай народна-паэтычнай творчасці дзякуючы лаканічнай